**16 ліпеня 2025 г. - 85 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Андрэевіча Семенюка (1940-2018), беларускага філосафа, палітолага, доктара філасофскіх навук (1990), прафесара (1993)**



Уладзімір Андрэевіч Семянюк нарадзіўся 16 лістапада 1940 года ў в. Залессе Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Бацькі былі простыя сяляне, працавалі ў калгасе імя А. В. Суворава. У сям'і было трое сыноў, усе змаглі атрымаць добрую адукацыю, заняць высокае становішча ў грамадстве. Старэйшы Пётр стаў вайскоўцам, сярэдні Мікалай быў галоўным аграномам у калгасе, Уладзімір, малодшы з братоў, стаў прафесарам філасофіі. Сястра Марыя працавала настаўніцай у Залескай сярэдняй школе.

Дзяцінства Уладзіміра было такім жа, як і ўсіх аднагодкаў ваеннай і пасляваеннай пары. У сялянскай сям'і даводзілася шмат працаваць, дапамагаць маці па гаспадарцы, бо бацька рана памёр. У школе хлопчык вучыўся старанна, займаўся спортам. У 1958 годзе скончыў Залескую сярэднюю школу з залатым медалём, паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна. Вышэйшая адукацыя тады была рэдкасцю на вёсцы.

Пасля заканчэння ўніверсітэта (1963) Уладзімір Семянюк працаваў настаўнікам у Глыбоцкім раёне, але цяга да ведаў, самаўдасканалення падштурхнулі яго займацца навуковай дзейнасцю. У 1964–1967 гадах – аспірант Інстытута філасофіі і права АН БССР, потым малодшы навуковы супрацоўнік гэтага інстытута. Тэмай сваіх навуковых прац абірае гісторыю філасофіі і рэлігіі.

З 1968 года Уладзімір Андрэевіч – дацэнт кафедры філасофіі Беларускага інстытута фізічнай культуры. У 1969 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю «Христианское учение о смысле и цели человеческой жизни».

Яркім эпізодам у біяграфіі Уладзіміра Андрэевіча стала праца ў Польшчы. У 1978–1981 гадах ён чытаў лекцыі па філасофіі на польскай мове ў Вышэйшай інжынернай школе ў г. Зялёна-Гура (Польшча).

1990-я гады – цяжкія часы для краіны і навукі. Многія навукоўцы пакінулі інстытуты і сталі бізнесменамі ці проста

гандлярамі. Але ў гэты няпросты час Уладзімір Андрэевіч не пакінуў навуку і нават дасягнуў у ёй новага ўзроўню. У 1989–1993 гадах – дацэнт, прафесар кафедры сацыялогіі і медыцынскай этыкі Беларускага інстытута ўдасканалення ўрачоў. У 1990 годзе абараніў доктарскую дысертацыю «Сионизм в антикоммунистической и неоколониалистикой стратегии империализма (социально-политический анализ)», стаў доктарам філасофскіх навук, у 1993 годзе – прафесарам.

З 1994 года У. А. Семянюк – прафесар кафедры «Философские учения» факультэта тэхналогій кіравання і гуманітарызацыі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, дзе доўгі час працягваў працаваць, бо яго веды і вопыт былі запатрабаваны. У суаўтарстве з вучоным распрацоўваліся навучальныя дапаможнікі і дапаможнікі для кантролю ведаў, метадычныя рэкамендацыі па падрыхтоўцы аспірантаў для здачы кандыдацкага мінімуму па філасофіі. Нямала маладых спецыялістаў атрымалі кваліфікаваную дапамогу і пуцёўку ў жыццё ад Уладзіміра Андрэевіча.

Навуковыя інтарэсы: гісторыя філасофіі; айчынная філасофская думка. Галоўныя навуковыя працы: «Христианский гумманизм » (1969), «Сионизм в политической стратегии империализма» (1981), «Современный сионизм: курсом политичских и военных авантюр» (1986).

На ўсё жыццё Уладзімір Семянюк захаваў любоў да родных мясцін. Кожнае лета наведваў родную вёску, не прадаваў стары бацькоўскі дом.

У. А. Семянюк памёр 17 лютага 2018 года, пахаваны на могілках в. Залессе.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2025 г. Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна,
бібліёграф I кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі

## Працы У. А. Семенюка

**Семенюк, В. А.** Античная философия : учебное пособие по курсу философии для студентов, магистрантов и аспирантов : учебное электронное издание / В. А. Семенюк. - Минск : БНТУ, 2008.

**Семенюк, В. А.** Беседы о природе и обществе / [М. Я. Резников, В. А. Семенюк и др.]. – Изд. 2-е, доп. и дораб. – Минск : Вышэйшая школа, 1971. – 207 с.

**Семянюк, У. А.** Гуманізм па-хрысціанску / Уладзімір Семянюк. – Мінск : Беларусь, 1969. – 53, [1] с. – (Бібліятэчка атэіста).

**Семенюк, В. А**. Зловещий альянс / В. А. Семенюк. – Мінск, 1972.

**Семенюк, В. А**. Идея возрождения России через православие и религиозность русской души в творчестве Лосского Н. О. / Владимир Андреевич Семенюк // Евразийское пространство диалога Беларуси, Казахстана, России, Армении, Кыргызстана: культура, философия, экономика: материалы Международной научной конференции, 17 марта 2016, г. Минск / отв. ред. Александр Иванович Лойко. - Минск: БНТУ, 2016. С. 225-230.

**Семенюк, В. А**. Критика религиозного понимания смысла человеческой жизни : материал в помощь лектору / В. А. Семенюк. – Минск, 1977. – 19 с.

**Семенюк, В. А**. Критика христианского учения о смысле и высшей цели человеческой жизни : автореферат диссертации … кандидата философских навук / В. А. Семенюк. – Минск, 1968. – 23 с.

**Семенюк, В. А**. Националистическое безумие: идеология, политика и практика международного сионизма / В. А. Семенюк. – Минск : Беларусь, 1976. – 256 с.

**Семенюк, В. А.** Преступления сионизма на Ближнем Востоке : материал в помощь лектору / В. А. Семенюк ; Правление общества «Знание» Белорусской ССР, Координационный совет по политическому обличению империализма. - Минск, 1972. – 18 с.

**Семенюк, В. А.** Сионизм в антикоммунистической и неоколониалистикой стратегии империализма (социально-политический анализ) : диссертация ... доктора философских наук : 09.00.02 : защищена 00.00.0000 : утверждена 31.08.1990 / Семенюк Владимир Андреевич. — Минск, 1986.

**Семенюк, В. А.** Сионизм в антикоммунистичской и неоколониальной стратегии империализма. Социально-политический анализ : автореферат диссертации … доктора философских наук : 09.00.02 / Семенюк Владимир Андреевич. – Минск, 1989. – 41 с.

**Семенюк, В. А.** Современный сионизм : курсом политических и военных авантюр / В. А. Семенюк. – Минск : Беларусь, 1986. – 236, [2] с.

**Семенюк, В. А.** Сионизм в политической стратегии империализма / В. А. Семенюк. – Минск : Беларусь, 1981. – 172, [2] с.

**Семенюк, В. А.** Судный день / Владимир Семенюк. – Минск, 1966. – 34, [2] с. – (Беседы с верующими).

**Семенюк, В. А**. У истоков отечественной мысли: Е. Полоцкая, К. Туровский и К. Смолятич / Семенюк В. А. // Духовные ипостаси Евфросинии Полоцкой: историческая и современная : материалы Междунар. науч. конф. (Минск, 12 мая 2016 года). – Минск, 2016. С. 137–143.

**Семенюк, В. А**. Философская и социально-политическая мысль Беларуси : методическое пособие для студентов, магистрантов и аспирантов / В. А. Семенюк. – Минск : БНТУ, 2011. – 53, [1] с.

**Деришев, С. И.** Баптизм и баптисты : (социологический очерк) / [С. И. Деришев, В. А. Семенюк и др.]. – Минск : Наука и техника, 1969. – 318 с., [1] л. табл.

## Аб жыцці і дзейнасці У. А. Семенюка

**Семянюк Уладзімір Андрэевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 440-441 : фат. (Імі ганарацца землякі).

**Семянюк Уладзімір Андрэевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. - 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын, 2020. - С. 134-135 : фат. - (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

**85 гадоў** з дня нараджэння У. А. Семенюка (1940) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 181.

**Курачук, С.** Люди белорусской науки – наши земляки / Светлана Курачук // Кобрынскі веснік. – 2024. – 27 студзеня (№ 4). - С. 14 : фот.

Накануне Дня белорусской науки Кобринская центральная районная библиотека представляет проект «Людзі навукі нашага краю».

**Курачук, С.** Кобринское слово сказано и в науке / Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2017. – 20 июля. – С. 5.

Центральная районная библиотека ГУК «Кобринская районная централизованная библиотечная система» начинает работу над очередным проектом «Славутыя імёны Кобрыншчыны», первый этап которого – база данных «Людзі навукі нашага краю».

**Курачук, С**. Людзі навукі нашага краю / Святлана Курачук // Кобрынскі веснік. – 2017. – 5 красавіка. – С. 3.

Цэнтральная раённая бібліятэка ДУК "Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма" пачынае працу над чарговым праектам "Славутыя імёны Кобрыншчыны", першы этап якога – база даных "Людзі навукі нашага краю".

**Курачук, С**. Портреты интеллекта. Учёные Кобринщины : Знакомьтесь - биобиблиографический справочник об ученых нашего края / Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2017. – 9 ноября. – С. 33.

Ко Всемирному Дню науки было приурочено издание библиографами Кобринской центральной районной библиотеки биобиблиографического справочника «Людзі навукі нашага краю» из серии «Імёны на карце Кобрыншчыны».

Рэгіён:

**Кобрын**

**Кобрынскі раён**

**Залессе**

Імёны:

**Семянюк Уладзімір Андрэевіч**

Прадметы:

**Вучоныя**

**Філосафы**

**Прафесары**